**20.** Уважліва прачытайце вершаваную загадку М. Пазнякова. Вызначце слова-адгадку ў пераблытаных складах.

*Стракаты, крылаты –*
*Руплівец лясны,*
*Лекар заўзяты*
*У хворай сасны.*

**А)** дзюбжакры. **Б)** бейраве. **В)** целдзя.
**Г)** сакгу. **Д)** рукцяце.

---

**21.** Колькі разоў сустракаецца апошні гук назоўніка ***цвік*** у словах вершаванай загадкі М. Пазнякова?

*Выраслі ў полі браточкі*
*І зазванілі ў званочкі:*
*– Жніце нас і малаціце,*
*Дзеткам пячэнне рабіце. (Авёс.)*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**22.** Якое ўстойлівае спалучэнне мае значэнне *‘блізка, у непасрэднай блізкасці ад каго-небудзь, чаго-небудзь’*?

**А)** пакінуць з носам. **Б)** пад самым носам. **В)** на носе.
**Г)** узяць з-пад самага носа. **Д)** кляваць носам.

---

**23.** Каго ў народзе называюць *“чацвераногім лесарубам”*?

**А)** ваўка. **Б)** барсука. **В)** мядзведзя. **Г)** бабра. **Д)** рысь.

---

**24.** Дадзены народныя загадкі.

*1. Галава ў вадзе, а хвост на сушы.*
*2. Круглы, як сонца, шыпіць пад ім донца.*
*3. Не мора, а хвалюецца.*
*4. Жалезны нос у зямлю ўрос.*
*5. Ноччу лятае, а днём адпачывае.*



Дадзены варыянты адгадак:

*а) плуг; б) блін; в) савá; г) ніва; д) коўш.*

Калі правільна размясціць адгадкі на загадкі, то ў выдзеленым вертыкальным радку красворда можна прачытаць адгадку на загадку *хто, не гаворачы, вучыць*.

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г, 5-д. **Б)** 1-б, 2-в, 3-д, 4-а, 5-г.
**В)** 1-в, 2-д, 3-г, 4-б, 5-а. **Г)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-д, 5-б.
**Д)** 1-д, 2-б, 3-г, 4-а, 5-в.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»

КОНКУРС

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 1. Тыраж 26500 экз. 2021 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2021»

*Чацвер, 18 лютага 2021 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі дзеясловаў у народнай загадцы?

*Гудзе, як пчала, ляціць, як страла, крыламі не махае, хто адгадае?*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**2.** Вучні запісвалі сказ пад дыктоўку:

*Пад вечар ля сажалкі зноў пачалі квакаць … .*

Які назоўнік не паспеў напісаць Ясь?

**А)** вароны. **Б)** гусі. **В)** качкі. **Г)** жабы. **Д)** кнігаўкі.

---

**3.** Аленка атрымала заданне вызначыць, колькі двухскладовых назоўнікаў ужыта ў вершаваных радках С. Сокалава-Воюша. Дапамажыце дзяўчынцы правільна выканаць заданне.

*Жвава круцяцца жаронцы,*
*Як жаўток, жаўцее сонца,*
*Жнівень ходзіць па зямлі,*
*Жыта зносіць у кулі.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 6. **Д)** 8.

**4.** Вымаўленне якога слова (ці слоў) не супадае з напісаннем?

*1) горад; 2) мароз; 3) пірог.*

**А)** усіх слоў. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**5.** Якія словы правільна падзелены для пераносу?

*1) падж-аць; 2) пад’-ём; 3) асі-на; 4) ю-нак.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**6.** Дадзены сказы:

*1. Плывец плыве, а пешаход … .* *а) клякоча;*
*2. Спявак спявае, а баяніст … .* *б) ідзе;*
*3. Сабака гаўкае, а бусел … .* *в) іграе.*

Якія дзеясловы прапушчаны? Падбярыце правільныя варыянты.

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**7.** Выберыце з прапанаваных толькі неадушаўлёныя назоўнікі.

*1) паштальён; 2) гімназія; 3) вецер; 4) школьнік.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**8.** Вучні павінны былі вызначыць колькасць ужытых у сказе асабовых займеннікаў.

*Будзь добры з прыродай, і яна пакажа табе свае таямніцы.*

Мікола сказаў, што ў дадзеным сказе асабовых займеннікаў няма. Алёна вызначыла адзін асабовы займеннік, Ірына – два, Ігнат – тры. Хто з вучняў адказаў правільна?

**А)** Мікола. **Б)** Алёна. **В)** Ірына. **Г)** Ігнат. **Д)** ніхто з вучняў.

---

**9.** У некаторых мясцовасцях можна пачуць: “*Ясны веташóк – на сцюжу.*” Які назоўнік з’яўляецца адпаведнікам слова *веташóк*?

**А)** дзень. **Б)** вечар. **В)** ноч. **Г)** сон. **Д)** месяц.

---

**10.** Якія назоўнікі з прапанаваных адносяцца да мужчынскага роду?

*1) лебедзь; 2) вусень; 3) мазоль; 4) кураня.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**11.** Выберыце з дадзеных словы, якія маюць чатыры гукі.

*1) елка; 2) поле; 3) ежа; 4) свае.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**12.** Колькі назоўнікаў у форме множнага ліку назоўнага склону ў вершаваных радках С. Давідовіча?

*Ах, неба – месяц, зоркі,*
*Бяздонне, глыбіня.*
*Світанкі, надвячоркі,*
*Канец, пачатак дня.*

**А)** 0. **Б)** 3. **В)** 6. **Г)** 9. **Д)** 10.

---

**13.** Міколка павінен быў вызначыць назвы кветак з прапушчаным складам ***-мо-***.

*1) ра-..-нак; 2) зва-..-чак; 3) мі-..-за;*
*4) ва-..-шка; 5) пі-..-ня.*

Дапамажыце хлопчыку справіцца з заданнем.

**А)** усе назвы. **Б)** няма такіх назваў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**14.** Якую літару напішаце на месцы пропуску ў словах *ко..дра, ка..нер, шпако..ня, ласта..ка?*

**А)** в. **Б)** ф. **В)** й. **Г)** у. **Д)** ў.

---

**15.** Вы ведаеце назвы птушак *галка, папугай, голуб*. Які аднолькавы гук ёсць у назвах?

**А)** [а]. **Б)** [у]. **В)** [л]. **Г)** [г]. **Д)** [п].

---

**16.** Выберыце з дадзеных галосныя гукі.

*1) [й]; 2) [о]; 3) [ў]; 4) [э].*

**А)** усе гукі. **Б)** няма такіх гукаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**17.** Настаўніца задала вучням пытанне: “Які назоўнік не з’яўляецца назвай птушкі: *жаўна, бусел, крыжадзюб, гуслі, дрозд?*”. Улад сказаў, што гэта слова *жаўна*, Міхалка – *бусел*, Света – *крыжадзюб*, Люда – *гуслі*, Клава – *дрозд*.

**А)** Улад. **Б)** Міхалка. **В)** Света. **Г)** Люда. **Д)** Клава.

---

**18.** Усім вядома кніга Анатоля Клышкі пра першадрукара “Францыск Скарына, альбо Як … ”. Прадоўжыце назву.

**А)** жыў першадрукар. **Б)** да нас прыйшла кніга.
**В)** не забыць гісторыю. **Г)** свеціць Сонца. **Д)** друкуем кнігі.

---

**19.** Выберыце з дадзеных толькі тыя словы, у якіх пры перамене месца складу зменіцца лексічнае значэнне.

*1) ліпа; 2) лазня; 3) сіла; 4) хваля.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.